УДК 338.24(4)

А. У. Яфімаў, ст. выкладчык, Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

# АСАБЛІВАСЦІ РОЛІ ДЗЯРЖАВЫ І ПРЫВАТНАГА ЎЛАСНІКА Ў ТРАНСФАРМАЦЫІ ПЕРАХОДНЫХ ГАСПАДАРАК

The article concerns some features of transformational process in transitive economies during two decades. Author presents the division of post-communist countries into three groups. Description of role of state and different types of owners in efficient building of market economy in these countries leads us to multivalued conclusions. In countries of CIS the place of state in economy during transition is traditionally more considerable then in others. Varied types of owners in different countries under various circumstances have obtaining different results. There is no also strict correlation between privatization of enterprises in post-communist countries and next its effective working. Also successes and failures in Belarus and neighboring states during last period of transformation had showed.

**Уводзіны**. Ва ўмовах пераходнай эканомікі побач з пытаннямі шпаркасці ажыццяўлення пэўных гаспадарчых пераўтварэнняў, стаіць запыт пра іх эфектыўнасць. Пры ацэнцы макраэканамічных паказчыкаў развіцця той ці іншай з 29 дзяржаў, якія паслядоўна разглядаюцца рознымі даследчыкамі транзітыўных эканомік, узнікае патрэба прааналізаваць канкрэтныя чыннікі поспеху ці паразы на шляху стварэння рынкавай сістэмы. Адной з найбольш прадстаўнічых крыніцаў для атрымання такога кшталту інфармацыі з’яўляецца штогадовая справаздача эканамічных аналітыкаў Еўрапейскага Банка Рэканструкцыі і Развіцця (ЕБРР) *Transition Report*, якая выдаецца з 1994 года. За гэты час даследчыкі дадзенай установы назапасілі пэўную колькасць крытычнага матэрыялу, які дае падставу для больш глыбокага аналізу трансфармацыйных працэсаў.

Паколькі наша краіна знаходзіцца ў пачатковай стадыі пабудовы рынкавай эканомікі, дзе рэформы адбываюцца з 1992 года, і апошнім часам у некаторых кірунках ажыццяўленне іх актывізавалася, з гэтага вынікае *актуальнасць* дадзенага артыкула. Яго *мэтай* выступае акрэсленне характару ўплыву дзяржавы і розных відаў уласнікаў на поспех рэфармавання як на мікра-, так і на макраўзроўні, разам з апісаннем дасягненняў Беларусі і суседніх краінаў у гэтай сферы.

**Азначэнне ролі дзяржавы ў пераходнай эканоміцы**. Са шматлікіх вызначальнікаў эфектыўнасці трансфармацыі дазволім сабе даволі схематычна закрануць ролю двух – дзяржавы і прыватнага ўласніка.

*Першае пытанне* заключаецца ў тым, якое месца мусіць адыгрываць дзяржава як палітычны і эканамічны інстытут на працягу пераходнага перыяду? Альбо прыняць на сябе функцыі кантролю за больш-менш значнымі гаспадарчымі працэсамі, зрабіўшы сваю прысутнасць відавочнай і адкрытай; ці заняць мінімалісцкую пазіцыю і назіраць зверху на адносна вольную гульню рынкавых сілаў; альбо пайсці на прамежкавы варыянт, які дапускае пэўнае ўмяшальніцтва па ступені яго неабходнасці. У тэорыі постсацыялістычнай трансфармацыі, якая склалася за гэтыя гады са шматлікіх фактаў досведу развіцця пераходных краінаў, прысутнасць дзяржавы, на наш погляд, збольшага імкнецца да *памяркоўнай* пазіцыі, калі б можна было гэты паказчык разлічыць матэматычна. Тут варта прыгадаць адзін з прынятых у прафесійнай літаратуры дадзенага кірунку доследаў варыянтаў падзелу існых пераходных эканомік на краіны *СНД і Манголію* (13 дзяржаў), краіны *Паўднёва-Усходняй Еўропы* (8 дзяржаў[1]), краіны *Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Балтыі* (8 дзяржаў) [10, с. ii-iii], [4, с. 16]. Так сталася, што ў *першых* з іх дзяржава (у т. л. па інерцыі савецкага перыяду) адыгрывае бóльшую ролю ў гаспадарчых пераўтварэннях, а ў *другіх* і *трэціх* – меншую. Некаторыя аналітыкі з краін першай групы выступаюць за больш актыўную ролю дзяржавы ў юрыдычнай сферы як гарантыю ад крыміналізацыі эканомікі і паслядоўную памяркоўную пазіцыю яе ў справе фармавання нацыянальнага фінансавага капіталу [2, с. 75]. Шматлікія даследчыкі з развітых краін адзначаюць істотную розніцу ў стварэнні элементаў рынкавай інфраструктуры паміж краінамі першай і трэцяй групаў. Адпаведна ўзнікае тлумачэнне, чаму тая ці іншая форма прыватызацыі ў краінах СНД не дала такога плёну, як у суседніх дзяржавах. Прыводзяць прыклады неабходных дапрыватызацыйных інстытуцыянальных зменаў, якія мусіць ажыццявіць дзяржава[2] (сюды залічваецца спецыфікацыя правоў уласнасці на пэўны актыў, стварэнне рынкаў зямлі і

[1] Сюды аднесены Балгарыя, Харватыя, Румынія, Албанія, Боснія і Герцагавіна, Македонія, Чарнагорыя, Сербія.

[2] Тэорыя г. зв. «інстытуцыянальных пасткаў», развітая расійскім даследчыкам В. Палтэровічам на прыкладзе досведу трансфармацыі яго краіны, якраз абгрунтоўвае неабходнасць уплыву дзяржавы ў працяглай перспектыве, скіраванага як на пераадоленне наступстваў паўсталых негатыўных інстытутаў кшталту бартэру, карупцыі, запазычанасці ў разліках, так і на прадухіленне мажлівага з’яўлення ўмоў для ўзнікнення такіх інстытутаў [9].

прадукцыйнага капіталу) [6, с. 86]. Можна адзначыць абгрунтаванне неабходнасці правядзення актыўнай прамысловай палітыкі, якая прадугледжвае ў т. л. канструяванне будучых, постпрыватызацыйных структур пэўных стратэгічных галінаў нацыянальнай гаспадаркі, а таксама часовую рознабаковую падтрымку прадпрыемстваў у крызісным стане [6, с. 86–87]. Таксама ў якасці неабходнасці ажыццяўлення вызначанай прамысловай палітыкі называецца як негатыўны досвед першых гадоў трансфармацыі, так і неадпаведнасць неакласічнай мадэлі функцыянавання гаспадаркі ўмовам, што існуюць у постсацыялістычных краінах, разам з няведаннем рэфарматарамі рынкавай практыкі [3, с. 22, 26]. Яшчэ варта падаць той факт, што ў другой і трэцяй групах краінаў па ступені набліжэння іх характарыстык да пастаўленых арыенціраў (у прыватнасці, паступовай перадачы крытычнай масы актываў у прыватнае валоданне), г. зн. з цягам часу, роля дзяржавы паслядоўна памяншаецца і набліжаецца да адпаведнай у развітых краінах. Краіны ж СНД часцяком не паказваюць такой тэндэнцыі, і роля дзяржавы тут можа заставацца па-ранейшаму значнай.

**Азначэнне ролі прыватнага ўласніка ў пераходнай эканоміцы**. *Другое пытанне* таксама закранае дзяржаву, але ўжо як суб'ект, які распараджаецца пэўнымі актывамі. З другога боку, маем супрацьлеглы суб'ект, які дамінуе ў якасці ўласніка ў развітых краінах. Наколькі прыватнік вызначае прагрэс у рэформах? Адным з найцікавейшых аспектаў дадзенага пытання выступае разгляд адказаў на традыцыйную, шматаспектавую дылему: якая форма ўласнасці больш (і найбольш) эфектыўная ў гаспадарчым плане – прыватная ці дзяржаўная?

Пры спробах знайсці адказ на гэтае пытанне трэба ўлічваць шмат акалічнасцяў, якія тычацца аналітычных сродкаў. Мы сабе можам дазволіць улічыць толькі некалькі крыніцаў, якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць перш за ўсё кірункі мыслення даследчыкаў з развітых краін.

У аглядзе назапашанай за некаторы час літаратуры тры брытанскія даследчыкі цытуюць ідэю пра тое, што калі на ранніх этапах трансфармацыі ў гаспадарчым асяродку дамінавалі мяккія бюджэтныя абмежаванні, з прычыны пэўных дамоўленасцяў паміж менеджэрамі і дзяржаўнымі ўстановамі, сам факт прыватызацыі слаба ўплываў на эфектыўнасць дзейнасці прадпрыемстваў [1, с. 14]. Адсюль робіцца выснова, што істотнае падвышэнне эфектыўнасці дасягаецца толькі шляхам кардынальнага змяншэння ролі дзяржавы, г. зн. увядзення жорсткіх бюджэтных абмежаванняў. Яшчэ адна цытата тычыцца разгляду ролі менеджэраў на прададзеных прадпрыемствах – найбольш эфектыўнымі тут выступаюць нанятыя ўласнікам вонкавыя кіравальнікі. І нарэшце, у параўнанні новых прыватных прадпрыемстваў і раней прыватызаваных, рэй вядуць першыя. У якасці высновы падаецца вынік пакуль слабай сувязі паміж формай уласнасці і эфектыўнасцю, за выняткам новых фірмаў [1, с. 23]. Іншыя тры даследчыкі канстатуюць такую сувязь, прычым пераважна ў краінах трэцяй групы, дзе на сярэднім і пазнейшых этапах рэформаў пануюць жорсткія бюджэтныя абмежаванні [7, с. 360]. П. Дж. Хэйр адзначае факт станоўчага ўплыву на эфектыўнасць функцыянавання толькі ў выпадку прыцягнення замежнага інвестара, не аддаючы прыярытэту іншым відам уласнікаў [6, с. 81], а таксама адзначае лепшы вынік трансфармацыі ў краінах трэцяй групы (беручы ў т. л. пад увагу тую акалічнасць, што ў Польшчы першай з пераходных гаспадарак быў дасягнуты ўзровень ВГП 1989 г., у 2000 г. ён быў роўны 127% да паказчыка 1989 г., у Венгрыі – адпаведна 104%), чым першай (ВГП Расіі ў 2000 г. складаў 63% да ўзроўню 1989 г., ва Украіне – толькі 42%) [6, с. 82–84]. Два амерыканскія эканамісты на аснове разгляду дастатковай колькасці адносна нядаўніх даследаванняў робяць выснову, што «прыватызацыя ў правільным кірунку альбо ў правільных абставінах можа прынесці даволі станоўчыя вынікі; але прыватызацыя можа быць і вельмі разбуральнай[1]» [8, p. 748].

**Характэрныя рысы пераўтварэнняў у Беларусі і суседніх краінах.** Каб скіраваць увагу на нашу краіну, варта звярнуцца да пэўных якасных паказчыкаў трансфармацыі, змешчаных у апошняй справаздачы *Transition Report* [4, с. 9].

У табл. пададзены кампаратыўныя вынікі[2] працэсу пераходу Беларусі і суседніх краінаў. У першым слупку трапляе ў вочы відавочны кантраст паміж пераважным стварэннем усяго аб'ёму канчатковых тавараў і паслуг прыватным сектарам, вага якога даходзіць да ¾ у Літве і Польшчы, і параўнальна невялікай роляй недзяржаўнай сферы ў нашай краіне.

[1] Узгаданыя вышэй два даследчыкі з РАН, разглядаючы пачатковы досвед расійскіх рэформаў, паказваюць марнасць спадзяванняў на поспех у пабудове рынкавай эканомікі, калі афіцыйныя асобы арыентуюцца на дастатковасць прыватызацыі і лібералізацыі. На іх думку, важную ролю адыгрывае якасць г. зв. карпаратыўнага кіравання. І ў дадзеным выпадку форма ўласнасці часта менш важная за магчымасць эфектыўна ёй кіраваць [2, с. 72, 75].

[2] Паказчыкі (індыкатары) ЕБРР, прадстаўленыя ў дакладзе Transition Report, могуць прымаць значэнні ад 1 (самы пачатак зменаў у кірунку стварэння рынкавай эканомікі) да 4+ (дасягненне стандартаў развітых краінаў) [10, с. 198].

Табліца

**Некаторыя параўнальныя паказчыкі развіцця постсавецкіх краінаў у 2008 годзе**

| Краіна | Доля прыватнага сектара ў стварэнні ВГП, % | Паказчык ЕБРР прыватызацыі буйных прадпрыемстваў | Паказчык ЕБРР прыватызацыі малых прадпрыемстваў | Паказчык ЕБРР кіравання і структурных рэформаў на прадпрыемствах |
|---|---|---|---|---|
| *Беларусь* | *30* | *2–* | *2+* | *2–* |
| Латвія | 70 | 4– | 4+ | 3 |
| Літва | 75 | 4 | 4+ | 3 |
| Польшча | 75 | 3+ | 4+ | 4– |
| Расія | 65 | 3 | 4 | 2+ |
| Украіна | 65 | 3 | 4 | 2 |

Калі далей улічыць змешчаныя тут прапанаваныя аналітыкамі з ЕБРР некаторыя паказчыкі рэфармацыйных мерапрыемстваў, становіцца відавочным факт прыналежнасці нашай краіны да групы аўтсайдэраў рэформаў. Па двух з трох вызначальнікаў наша краіна мае вельмі нізкі бал, які адлюстроўвае невялікі памер пераўтварэнняў, фактычна кансервацыю раней створанай планавай гаспадаркі. За апошні прааналізаваны год аналітыкі ЕБРР адзначылі невялікія зрухі ў кірунку вялікай прыватызацыі, калі была акцыянавана некаторая колькасць дзяржаўных гаспадарчых суб'ектаў і створаны спіс для будучай прыватызацыі, а таксама дзяржавай было скасавана права ўвядзення г. зв. «залатой» акцыі ў выпадку неабходнасці на пераважнай колькасці айчынных прадпрыемстваў. Што тычыцца малых прадпрыемстваў, дык тут маем блізкі да сярэднега бал. Бачна таксама, што нашыя заходнія суседзі, якія належаць да трэцяй групы, найбольш прасунуліся ў стварэнні рынкавай гаспадаркі. Латвія, Літва і Польшча па паказчыку малой прыватызацыі вышлі на стандарты развітых краінаў свету.

Малюнак паказвае станоўчую скіраванасць павелічэння вагі прыватнага сектару ў стварэнні ВГП нашай краіны. Кепскім з'яўляецца тое, што на фоне іншых дзяржаў, нават са складу СНД, яна застаецца даволі малой. Пэўна, гэтыя 30% і прадукуюцца пераважна малымі рэфармаванымі прадпрыемствамі.




Малюнак. Доля прыватнай сферы ў стварэнні ВГП у трох усходнеславянскіх краінах у 2000–2008 гг., %

Яшчэ адной асаблівасцю, якая мае месца ў т. л. і ў нашай краіне, з'яўляецца тое, што ва ўмовах наяўнасці мяккіх бюджэтных абмежаванняў раней спрыватызаваныя прадпрыемствы не імкнуцца да правядзення далейшых структурных зменаў, што падкрэслівае французскі даследчык К. Рышэ [5, с. 29].

**Заключэнне**. Роля дзяржавы ў пераходным працэсе знаходзіцца на памяркоўнай пазіцыі, а ў краінах СНД яна звычайна была большай за астатнія постсацыялістычныя эканомікі.

Некаторыя працытаваныя даследванні, якія разглядаюць пытанне сувязі паміж відам уласніка і далейшай эфектыўнасцю функцыянавання прадпрыемстваў, не даюць канкрэтнага, станоўчага адказу на дадзенае пытанне. У адных групах краін пры адных абставінах важную ролю адыгрываюць адны віды ўласнікаў, у другіх – іншыя. Больш за тое, няма таксама адназначнай сувязі паміж праведзенай прыватызацыяй гаспадарчага суб'екта і далейшай эфектыўнасцю яго працы.

З адзначаных вышэй трох групаў пераходных эканомік за перыяд трансфармацыі найбольшага поспеху дасягнулі краіны трэцяй групы, за імі ідуць краіны другой, пасля – першай (калі меркаваць па макраэканамічных паказчыках, ацэнкавы памер рэальнага ВГП у 2005 г. да 1989 г. у гэтых краінах быў роўны адпаведна 133%, 97% і 87%; рост спажывецкіх коштаў па ацэнцы 2005 г. склаў адпаведна 3,3%, 5,7% і 9,9%; аб'ём прыцягнутых простых замежных інвестыцый за 1989–2005 гг. на душу насельніцтва дасягнуў адпаведна 2,714; 1,134 і 254 дол. ЗША [10, с. 32, 34, 38], пры аглядзе апошніх значэнняў трох індэксаў ЕБРР, якія тычацца рэфармавання прадпрыемстваў, назіраецца падобная заканамернасць: у сферы прыватызацыі буйных прадпрыемстваў краіны трэцяй групы маюць дыяпазон ад 3 у Славеніі да 4 у Венгрыі і інш., другой – ад 3 у Сербіі да 4 у Балгарыі, першай – ад 1 у Туркменістана да 4 у Грузіі; у сферы прыватызацыі малых прадпрыемстваў – адпаведна – 4+ ва ўсіх, ад 3 у Бос-

нii i Герцагавiне да 4+ у Харватыi, ад 2+ у нашай краiны i Туркменiстана да 4 у Арменii i iнш.; у сферы кiравання i структурных рэформаў на прадпрыемствах – адпаведна ад 3 у Латвii i iнш. да 4 у Венгрыi i iнш., ад 2 у Чарнагорыi i iнш. да 3 у Харватыi, ад 1 у Туркменiстана да 2+ у Расii i iнш. [4, с. 9]).

Нашай краiне яшчэ трэба прадпрыняць шмат неабходных захадаў, каб выйсцi на траекторыю ўстойлiвага эканамiчнага росту, у т. л. на iнавацыйнай глебе. Глыбокае вывучэнне паспяховага досведу рэфармавання суседнiх дзяржаў з трэцяй групы, разам з улiкам нацыянальных iнстытуцыянальных i iншых асаблiвасцяў, пры практычных дзеяннях у галiне трансфармацыi, дазволiць пазбегнуць дарагiх памылак i вызначыць аптымальную паслядоўнасць мерапрыемстваў.

## Лiтаратура

1. Биван, А. А. Факторы реструктуризации предприятий в переходных экономиках / А. А. Биван, С. Эстрин, Е. С. Шаффер // Эконом. журнал Высшей школы экономики. – 2002. – № 1. – С. 3–27.

2. Евстигнеева, Л. Реструктуризация предприятий – ключ к восстановлению управляемости экономикой / Л. Евстигнеева, Р. Евстигнеев // Власть. – 1995. – № 10. – С. 72–75.

3. Нильсен, К. Промышленная политика и реструктуризация в странах Центральной и Восточной Европы / К. Нильсен // Проблемы теории и практики управления. – 1995. – № 6. – С. 22–26.

4. Процесс перехода и показатели стран СНГ и Монголии. Извлечение из Доклада о процессе перехода за 2008 год // Европейский банк реконструкции и развития [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым доступу: http://ebrd.com/pubs/econo/tr08r.pdf. – Дата доступу: 1.09.2009.

5. Рише, К. Реорганизация фирм и промышленная политика в странах с переходной экономикой / К. Рише // Проблемы теории и практики управления. – 2001. – № 6. – С. 25–32.

6. Хэйр, П. Дж. Достижения и уроки реструктуризации промышленных предприятий / П. Дж. Хэйр // Проблемы теории и практики управления. – 2002. – № 5. – С. 81–87.

7. Commander, S. Restructuring in Transition Economies: Ownership, Competition, and Regulation / S. Commander, M. Dutz, N. Stern // Annual World Bank Conference on Development Economics 1999. – Washington: World Bank, 2000. – P. 345–373.

8. Djankov, S. Enterprise Restructuring in Transition: A Quantitative Survey / S. Djankov, P. Murrell // Journal of Economic Literature. – 2002. – Vol. 40, Issue 3. – P. 739–792.

9. Polterovich, V. Institutional Trap / V. Polterovich // The New Palgrave Dictionary of Economics. Second Edition. Eds. Steven N. Durlauf and Lawrence E. Blume [Electronic resource]. – Palgrave Macmillan, 2008. – Mode of access: http://www.dictionaryofeconomics.com/article?id=pde2008_i000262. – Date of access: 7.10.2008.

10. Transition Report 2006. Finance in Transition. – London: European Bank for Reconstruction and Development, 2006. – viii+204 p.